

М. БАНДАРЭНКА
бібліятэкар аддзела маркетынгу,
сацыякультурнай дзейнасці
і метадычнай работы Мазырскай
цэнтральнай бібліятэкі
імя А.С. Пушкіна

# У сэрцы маім малітва адна — Айчына

## Бібліядаследаванне

***Мэты:*** пашырыць веды пра жыццёвую і творчую дзейнасць Я. Брыля, зразумець ідэйна-мастацкі і філасофскі змест апавядання “Memento mori”, спрыяць асэнсаванню маральнага подзвігу чалавека ў гады Вялікай Айчыннай вайны і вартасці чалавечага жыцця ў наш час.

***Задачы:*** стварыць умовы для выхавання пачуцця павагі да гераічнага мінулага беларускага народа, непрымання вайны як антычалавечнай з’явы; развіццё аналітычнага мыслення вучняў.

***Удзельнікі:*** вучні 9–11 класаў.

***Абсталяванне:*** партрэт Я. Брыля; выстава “«Memento Mori»: напамін, неабходны кожнаму”. Памятай пра смерць навечна жывых»; урывак сімфанічнай паэмы Г. Вагнера “Вечна жывыя”, запіс песні В. Мурадэлі “Бухенвальдскі набат”, фотаздымкі спаленай вёскі Шавулічы; рэпрадукцыя карціны “Хатынскі набат” Уладзіміра Міхайлоўскага.

***Эпіграфам*** могуць стаць наступныя выказванні: “Выжываць – гэта любой цаной, а жыць – гэта ўсёткі менш ці больш сумленна” (Янка Брыль).

“За паэтычнай, лірычнай атмасферай яго твораў адчуваецца ўдумлівае пранікненне ў глыбіні чалавечай псіхалогіі” (А. Адамовіч).

### Ход мерапрыемства

**Бібліятэкар.** Вайна… Сёння мы ўяўляем яе па ўспамінах ветэранаў, па кадрах кінахронікі, па творах мастацкай літаратуры. Аб ёй напамінаюць брацкія магілы, помнікі. У вайны жудасная, трагічная статыстыка. І пра гэта трэба ведаць і памятаць.

Адным з помнікаў народу-змагару з’яўляецца навела Янкі Брыля “Memento mori”. Усяго тры старонкі, але яно вартае некаторых тамоў.

Са старажытных часоў чалавецтва знаёмае з лацінскім выразам “Memento mori”. Што гэта значыць? *(Адказы.)*

**Вучань-даследчык.** Назва “Memento mori” (“памятай пра смерць”) узята аўтарам з антычнай культуры. Гэтае выслоўе нагадвала старажытным рымлянам і грэкам пра неабходнасць пагарджаць жыццём, памятаючы, што не ва ўсіх абставінах яно жаданае. Так, напрыклад, філосаф Сакрат у прызначаны час выпіў атруту і памёр, выконваючы несправядлівы прысуд афінскага суда. Ён адмовіўся ратаваць жыццё ўцёкамі, бо разумеў, што гэты ўчынак прымусіў бы афінян засумнявацца, ці верыў ён у тое, чаму вучыў іншых.

**Бібліятэкар.** У кантэксце апавядання Янкі Брыля старажытны афарызм нагадвае, што памяць пра смерць злучае героя з лёсамі продкаў, з іх маральнымі запаветамі жыць па-людску, не забываючы пра фактар часу, які не дае права на памылкі, бо жыццё кароткае. І жыць трэба так, каб нішто, як паказвае аўтар, не забіла, не знішчыла, не прынізіла ў чалавеку Чалавека.

Перад вамі партрэт Янкі Брыля *(дэманстрацыя)*. Што вам вядома пра жыццё і творчасць гэтага пісьменніка? Якія творы Я. Брыля вы чыталі ў папярэдніх класах або самастойна? *(Адказы.)*

Восемдзясят дзевяць гадоў жыцця народнага пісьменніка. Шлях не малы. Гады, праз якія шлях праходзіў, не былі лёгкімі і простымі — ні для краіны, ні для народа. Таксама і для самога пісьменніка. Напэўна, і для яго творчасці.

Літаратура наогул — гэта само жыццё ў своеасаблівай форме яго выяўлення. Яна пачынаецца з жыцця мастака — ягонага жыццёвага вопыту, багацця ўнутранага свету, збірання духоўных каштоўнасцей. Перш чым пісаць, Брыль прайшоў добрую школу жыцця.

*Паведамленне-прэзентацыя вучня пра жыццё і творчасць Я. Брыля "І шлях ідзе ў бясконцасць".*

"Першае маленства" будучага народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля *(Івана Антонавіча Брыля)* прайшло ў Адэсе, куды ў час Першай сусветнай вайны выехала сям'я. Тут і нарадзіўся 4 жніўня 1917 г. будучы пісьменнік. Калі хлопчыку ішоў пяты год, сям'я вярнулася на радзіму. Хутка памёр бацька і маці з дзецьмі засталася адна. Жыццё стала цяжкім.

Пра сваё "другое маленства" Я. Брыль расказаў у аповесці "Сірочы хлеб". У 1931 г. пісьменнік скончыў польскую сямігодку ў мястэчку Турэц і паступіў у Навагрудскую гімназію, але не змог вучыцца з-за цяжкага матэрыяльнага становішча.

У 1939 г. юнака прызвалі ў польскую армію. Калі пачалася Другая сусветная вайна, Янка Брыль удзельнічаў у баях пад Гдыняй, трапіў у нямецкі палон, пазней уцёк з палону і вярнуўся ў роднае Загора, якое знаходзілася пад акупацыяй.

У 1942 г. Я. Брыль стаў сувязным партызанскай брыгады, а ў 1944 г.— разведчыкам. У гэты час ён і пачаў пісаць свае творы.

Пасля вайны пераехаў у Мінск і стаў рэдактарам часопіса "Вожык". У 1946 г. выйшаў зборнік "Апавяданні".

Янка Брыль пісаў апавяданні, аповесці, мініяцюры, нарысы, эсэ, раманы. Вельмі запамінальнымі з'яўляюцца яго раман пра Вялікую Айчынную вайну "Птушкі і гнёзды", дакументальная кніга "Я з вогненнай вёскі", дзе былі сабраны жудасныя ўспаміны ацалелых жыхароў спаленых вёсак Беларусі, жорсткая і страшная праўда пра вайну і фашызм.

Творы Янкі Брыля перакладзены больш чым на 30 моў свету. Збор твораў пісьменніка сабраны і выдадзены ў 10 тамах.

**Бібліятэкар.** Нялёгкае дзяцінства, польская казарма, пачатак Другой сусветнай вайны і першае знаёмства з фашызмам, нямецкі палон, уцёкі, змаганне з ворагам у партызанскім атрадзе, складанасці першых пасляваенных гадоў... І ўсё гэта не збоку. Усё адчутае, перажытае пісьменнікам. Можна сцвярджаць: свае творы Брыль спачатку пражыў і перажыў у рэальным жыцці. Усе падзеі для Брыля і ў Брыля сталі асабістымі — і ў жыцці, і ў творчасці.

Янка Брыль — сапраўдны паэт у прозе — яшчэ сваімі першымі апавяданнямі пакарыў сэрцы чуйных да роднага слова чытачоў.



Усе мы час ад часу звяртаемся да сацыяльных сетак, каб даведацца пра чалавека, які нас цікавіць. І калі б пры жыцці народны пісьменнік Беларусі меў асабістую старонку ў добра знаёмай вам сацыяльнай сетцы, якой бы мы ўбачылі яе, на вашу думку?

*Вучні запаўняюць "профіль" Янкі Брыля. Гучыць урывак сімфанічнай паэмы Г. Вагнера "Вечна жывыя"; разгляд фотаздымкаў спаленай вёскі Шавулічы Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці.*

**Калектыўная гутарка з дзецьмі**

**Бібліятэкар.** Ці даводзілася вам бываць у гэтых мясцінах? Што вы пра іх ведаеце? *(Адказы вучняў.)*

*Паведамленне-прэзентацыя вучня-экскурсавода пра вёску Шавулічы.*

Вёска Шавулічы да вайны была вялікая, прыгожая, з драўлянымі хатамі. Жыхары для навучання сваіх дзяцей будавалі двухпавярховую школу, меўся магазін. Жылі людзі ў вёсцы дружна, весела, было шмат моладзі, маленькіх дзяцей.

Раніцай 7 ліпеня 1943 г. фашысты пачалі расправу над жыхарамі вёскі Шавулічы за сувязі з партызанамі. А потым падпалілі хаты. Ахвярамі сталі 366 вяскоўцаў, 120 з якіх дзеці, спалена было 77 двароў, знішчана 94 сям'і.

*Хвіліна маўчання ў памяць ахвяр генацыду беларускага народа.*

*Паведамленне вучня пра гісторыю напісання апавядання "Memento mori".*

Янка Брыль напісаў апавяданне "Memento mori" ў 1958 годзе ва ўзросце 41 года. У яго аснову былі пакладзены сапраўдныя падзеі.

У апавяданні пісьменнік звярнуўся да адной з самых трагічных старонак вайны — спальванне вёсак з людзьмі. За гады вайны фашыстамі ў Беларусі поўнасцю, з усімі жыхарамі, было знішчана 627 вёсак. Сёння пра гэту вялікую трагедыю напамінаюць званы на мемарыяльным комплексе "Хатынь" на Лагойшчыне.

Сярод тысяч ахвяр, што згарэлі ў агні разам са сваімі аднавяскоўцамі, быў і сябар Янкі Брыля — Даніла Скварнюк *(прэзентуецца фотаздымак)*. Ён і стаў правобразам галоўнага героя твора.

З пісьменнікам іх аб'ядноўвала цікавасць да літаратуры, асветніцкая дзейнасць, яны захапляліся вучэннем Льва Талстога. Даніла Скварнюк меў залатыя рукі, быў выдатным сталярам, пячнікам.







Ён добра зарабляў, таму мог дазволіць сабе купляць кнігі, выпісваць беларускія газеты. Гэта быў чалавек вясёлага нораву, з добрым пачуццём гумару, любіў пажартаваць.

**Бібліятэкар.** Кароценькае апавяданне Я. Брыля "Memento mori" змяшчае ў сабе глыбокі філасофскі сэнс.

*Заданне: запоўніць табліцу-інфаграфіку.*

Звернемся да твора.

* Як аўтар пачынае апавяданне? Чаму?

*Абагульненне адказаў.* У экспазіцыі Я. Брыль заўважае, што для карнікаў расправа з мірным насельніцтвам была звычайным заняткам. Ворагі ў апавяданні — безаблічныя драпежнікі, розніца толькі ў тым, што фашысты апрануты ў стракатыя плашчпалаткі, а паліцаі — у чорныя шынялі. Але сярод гэтых вылюдкаў аўтар вылучае зондэрфюрэра, начальніка экспедыцыі, якому такія акцыі, відаць, досыць надакучылі. Яму яўна хацелася заняцца куды больш цікавай справай, таму фашыст непрыемна моршчыўся ад дзікага крыку і плачу.

* Якім паўстае зондэрфюрэр на старонках апавядання? Паразважайце, ці можа што-небудзь чалавечае абудзіцца ў сэрцы зондэрфюрэра?

*Абагульненне адказаў.* Не можа быць прыстойным той, хто аддае загад спаліць мірных людзей жывымі.

* Якой перад чытачом паўстае асоба перакладчыцы?

*Абагульненне адказаў.* Гэта не чалавек, не жанчына, а "істота ў скураным паліто". Ужо ў адзенні яе ёсць агульнае паміж ёю і ворагамі ў чорных шынялях — жорсткасць, душэўная нікчэмнасць. Пісьменнік не хавае сваёй нянавісці да ворагаў, асабліва да тых, хто ім дапамагае.

* Чаму ў другой частцы апавядання Я. Брыль аддае перавагу дыялогу паміж упэўненым фашыстам і пячнікам?

*Абагульненне адказаў.* Дыялог зондэрфюрэра з пячнікам — кульмінацыйны момант у кампазіцыі твора, тут адбываецца супрацьстаянне характараў і сістэм духоўных каштоўнасцей. Беларускі селянін, які кіруецца ў жыцці традыцыйнай народнай мараллю, у гэтым паядынку перамагае палітычную дактрыну фашысцкай сістэмы. Агульначалавечая філасофія быцця непарушная і таму несмяротная, фашызм несумяшчальны з народнай філасофіяй і таму асуджаны на смерць.

* Што прымусіла зондэрфюрэра звярнуць увагу на старога? Чаму ён вырашыў дараваць яму жыццё? Якую рэакцыю чакаў афіцэр ад старога, а якую атрымаў?

*Абагульненне адказаў.* Карнік пажадаў неяк палепшыць свой настрой, падкрэсліць уласную "прыстойнасць" перад памочніцай і паказаць, што ён можа зрабіць усё, што захоча. Ад пячніка фашыст чакаў пакорнасці і ўдзячнасці. Відаць, спадзяваўся, што стары кінецца яму ў ногі, будзе цалаваць боты, але выйшла асечка, не прыняў чалавек-працаўнік такі "дарагі падарунак".




* Ці спадзяецца стары на выратаванне родных, суседзяў, аднавяскоўцаў?

*Абагульненне адказаў.* Ён ідзе на наіўную, але высакародную хітрасць. Але надзея гасне…

* Паназірайце, ці сапраўды на старонках апавядання нараджаецца подзвіг чалавека з народа? Дакажыце гэта радкамі з твора.

*Абагульненне адказаў.* "Пад чорнай навіссю броваў ажылі нарэшце вочы. Губы зусім перасталі дрыжаць. Нібыта не сваю, незвычайным жэстам узняў галаву: «А што ён думаў… Цьфу!..»"

* Паразважайце, чаму чалавек, які атрымаў магчымасць жыць, выбірае смерць?

*Абагульненне адказаў.* Пячнік фізічна гіне, але ўжо не як бездапаможная ахвяра, а як чалавек, які прымусіў ворага занервавацца і атрымаў над ім маральную перамогу. Горды і непакорны, не страціўшы сваёй годнасці, не здрадзіўшы сваім перакананням, сумленню, стары гіне. Гіне разам з роднымі, суседзямі, з усімі добрымі людзьмі. Ён не хоча жыць адзін, не хоча жыць, калі гінуць людзі ягонай вёскі, не хоча прымаць літасць ад крывавых рук катаў. І ён згарэў — адзін, хто мог бы ў той дзень не згарэць.

"І ён жыве".

Чаму гэтымі словамі заканчваецца твор?

* Як вы лічыце, чаму ў апавяданні няма назвы вёскі?

*Абагульненне адказаў.* Такіх вёсак на Беларусі было шмат. Спалена і разбурана 9200 вёсак, знішчана разам з жыхарамі 627 паселішчаў.

**Праца ў групах**

Кожная група атрымлівае аднолькавы спіс слоў, якія характарызуюць якасці пячніка і зондэрфюрэра. 1 група выпісвае словы-характарыстыкі пячніка, 2 група — зондэрфюрэра. Перад выконваннем задання паразважайце ў сваіх групах над наступнымі пытаннямі:

**I варыянт**

1. Якімі ідэаламі і справамі жыў пячнік?
2. Вызначце ролю партрэта ў характарыстыцы старога.
3. Якім паўстае пячнік з апошняга свайго маналога?

**II варыянт**

1. Якіх жыццёвых прынцыпаў прытрымліваўся зондэрфюрэр?
2. Чаму гэты "надчалавек" вырашыў падараваць жыццё пячніку?
3. Чым тлумачыцца хуткасць дзеяннаў зондэрфюрэра ў апошнія хвіліны жыцця пячніка?

*(Просты, пранілівы, несмяроты, геранчны, селянін, сумленны, выдатны, цудоўны, адданы, вынаходлівы, бескарыслівы, непакорны, і інш.*
*Бязлітасны, жорсткі, драпежнік, раўнадушны, прытворны, няшчыры, несправядлівы, фашыст, нікчэмны, і інш.)*

**Бібліятэкар.** Асобна разгледзім яшчэ адзін значны вобраз апавядання — вобраз перакладчыцы. Звярніце ўвагу на кластэр, што мы можам сказаць па кожнаму пункту?

Перад вамі рэпрадукцыя карціны "Хатынскі набат" Уладзіміра Міхайлоўскага *(дэманстрацыя)*. Параз-

важайце, ці можна сцвярджаць, што ідэя апавядання адпавядае зместу мастацкага палатна. *(Адказы.)*

Зварот да *эпіграфа*.

Прачытайце словы Янкі Брыля. Як вы іх разумееце?

*Абагульненне адказаў.* Нельга перамагчы народ з высокай маральнай перавагай над ворагам. Гэта і ёсць галоўная ідэя твора.

Вернемся да назвы апавядання. Як жа зразумець заклік пісьменніка "Памятай пра смерць"?

*Абагульненне адказаў.* Янка Брыль заклікае памятаць пра дзяцей, якія ніколі не будуць дарослымі, пра ўсіх, хто не выжыў, загінуў, згарэў у полымі вайны!

*Гучыць "Бухенвальдскі набат".*

Прапаную дома праслухаць сімфанічную паэму "Вечна жывыя" Генрыха Вагнера і паглядзець рэпрадукцыю карціны Анатоля Шыбнёва "Людзі, памятайце Хатынь!", а потым параўнаць творы музычнага і выяўленчага мастацтва са зместам апавядання "Memento mori" Янкі Брыля. А таксама паразважаць над выказваннем Уладзіміра Калесніка: "Памяць пра смерць можа адводзіць ад спакусы рабіць памылкі, перасцерагаючы, што не хопіць часу на адкупленне віны — жыццё кароткае..."

**Спіс літаратуры**

1. Брыль, Я. Ты мой найлепшы друг: Аповесці і апавяданні: для ст. шк. узросту / Прадм. С. Андраюка.— Мн.: Полымя, 1998.— 446 с., іл.

2. Брыль, Я. З людзьмі і сам-насам: запісы, мініяцюры, эсэ, апавяданні: для сярэд. і ст. шк. узросту / Янка Брыль.— Мінск: Маст. літ., 2011.— 343 с.

3. Геноцид белорусского народа: информационно-аналитические материалы и документы / Генеральная прокуратура Республики Беларусь; под общей редакцией А. И. Шведа.— Минск: Беларусь, 2022.— 175 с.: ил.

4. Немировский, А. И. Книга для чтения по истории древнего мира: для сред. шк. возраста.— 2-е изд., перераб. и доп.— М.: Просвещение, 1990.— 239 с.: ил.

5. Брыль, Я. Думы ў дарозе / Я. Брыль // Пяцьдзясят чатыры дарогі: аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў / склад. Я. Казека.— Мінск, 1963.— С. 62.

Бандарэнка, М. У сэрцы маім малітва адна – Айчына : бібліядаследванне / М. Бандарэнка // Бібліятэка прапануе. – 2025. - № 10. – С. 23-27.